**КІРЫЛАЎ** Мікалай Сцяпанавіч (10.3.1930, в. Пашкова Цвярской вобл., Расія — 15.12.2007), беларускі мастак-афарміцель, жывапісец. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1991).



*М.С.Кірылаў.*

Скончыў Вышэйшае маст.-прам. вучылішча імя В.Мухінай (1959). Аўтар праектаў комплекснага маст. афармлення экспазіцый Бел. музея гісторыі Вял. Айч. вайны (1964), ВДНГ БССР (1972, 1977) і інш. Працаваў у акварэлі. Цыклы лірычных, індустрыяльных пейзажаў К. прасякнуты захапленнем прыгажосцю прыроды, зямлі: серыі «Па Залатым кальцы» (1963), «Па Сібіры» (1971), «Па Беларусі» (1982). Дакладнасцю, кампазіцыйнай завершанасцю вылучаюцца партрэты: «Настаўніца Л.Булатава», «Цясляр А.Аляксееў» (абодва 1974), «Трактарыст Б.Тумураў» (1975), «Разьбяр па дрэве С.Гуткоўскі» (1976), «Шахцёр У.Сільчанка», «Медсястра Л.Лобан» (абодва 1981), «Ткачыха Г.Палійчук» (1983), «Фотамастак М.Шарай» (1995), а таксама графічныя «Акадэмік медыцыны І.М.Грышын», «Кінарэжысёр Ю.Азаронак» (абодва 1998) і інш.

*Г.А.Фатыхава.*



*М.Кірылаў. Кінарэжысёр Ю.Азаронак. 1982.*

**КІРЫЛІЦА**, адна з дзвюх старажытных славянскіх азбук (гл. таксама *Глаголіца*). Сваю назву атрымала ад імя слав. асветніка і прапаведніка хрысціянства Кірылы. Створана ў канцы 9 — пач. 10 ст. на аснове грэч. (візант.) урачыстага (унцыяльнага) пісьма, была пашырана ў паўд. і пэўны час зах. славян. Ва ўсх.-слав. землях уведзена ў сувязі з хрысціянізацыяй. Пісьмовыя помнікі эпохі станаўлення К. не захаваліся, таму ў дачыненні часу стварэння К. і яе храналагічных суадносін з глаголіцай існуе некалькі пунктаў гледжання. На думку адных вучоных (Я.Ф.Карскі, С.П.Абнорскі), К. была створана братамі Кірылам і Мяфодзіем раней за глаголіцу ў 9 ст., паводле другіх (В.Копітар, П.Я.Чарных) першай слав. азбукай, якую стварылі Кірыла і Мяфодзій у 863 г. (або 855), была глаголіца, трэція выказвалі меркаванне аб тым, што глаголіца і К. — почыркавыя разнавіднасці адной азбукі, магчыма, створаныя аднчасова адным аўтарам. Стварэнне К. прыпісваюць (Е.Георгіеў і інш.) вучням Кірылы і Мяфодзія (Кліменту Ахрыдскаму) і датуюць эпохай балгарскага цара Сімяона (893—927), паколькі літарны склад стараж. К. адпавядаў старaж.-балгарскаму маўленню, для перадачы гукаў якога унцыяльнае пісьмо было дапоўнена шэрагам літар (ж, ш, ъ, ь), у склад К. былі ўведзены дублетныя літары (і—и—ѵ, о — ѡ, ф — ѳ і інш.). У К. выкарыстоўваліся надрадковыя знакі: прыдыхання, націску, скарачэння слоў з цітламі. Літары К. мелі лічбавае значэнне: над літарай ставіўся знак цітлы, а па баках – адна і дзве кропкі. К. 11—14 ст. характарызавалася асаблівым тыпам пісьма — уставам з геаметрычнасцю ў абрысах літар. У пісьменнасці ўсх. і паўд. славян змянялася форма літар К., мяняўся іх склад і гукавое значэнне пад уздзеяннем моўных працэсаў у жывых слав. мовах: у рукапісах 12 ст. не выкарыстоўваюцца літары ётаваных юсаў (ѩ, ѭ) і юса вялікага (ѫ), у 13 ст. адзначаны пропуск літар ъ («ёр») і ь («ер»), якія замяніліся *о* і *е*, у некаторых рукапісах пачынаючы з 12 ст. літара ѣ («яць») пішацца на месцы *е*. Да сярэдзіны 14 ст. літары страцілі строгае геаметрычнае аблічча, узнікалі варыянты іх напісання, павялічылася колькасць скарочаных слоў; такі тып пісьма стаў называцца паўуставам. У канцы 14 ст. *устаў* і *паўустаў* замяніліся *скорапісам*. На аснове відазмененай і спрошчанай К. гістарычна склаліся сучасныя бел. і інш. ўсходне- і некаторыя паўд.-слав. алфавіты. У сучаснай бел. графіцы ёсць знакі для абазначэння спалучэння гукаў [jo] — («ё»), спецыфічнага кароткага гука [ў] — («ў»),

| Кірыліца: Літары і іх назвы | Кірыліца: Лічбавае значэнне | Грэчаскае ўстаўнае пісьмо | Кірыліца: Літары і іх назвы | Кірыліца: Лічбавае значэнне | Грэчаскае ўстаўнае пісьмо |
|---|---|---|---|---|---|
| А — аз | 1 | а | Х — хер | 600 | Х |
| Б — букі | | | Ѡ — амега | 800 | ω |
| В — ведзі | 2 | В | Ц — цы | 900 | |
| Г — глаголь | 3 | Г | Ч — чэрв | 90 | |
| Д — дабро | 4 | Д | Ш — ша | | |
| Є — есць | 5 | Є | Щ — шта | | |
| Ж — жывеце | | | Ъ — ёр | | |
| Ѕ — зяло | 6 | Ѕ | ЪІ — еры | | |
| Ꙁ — зямля | 7 | Z | Ь — ер | | |
| І — і | 10 | І | Ѣ — яць | | |
| И — іжэ | 8 | Н | Ю — ю | | |
| К — кака | 20 | К | Ꙗ — я | | |
| Л — людзі | 30 | λ | Ѥ — е | | |
| М — мыслеце | 40 | М | | | |
| N — наш | 50 | N | Ѧ — юс малы | | |
| О — он | 70 | О | Ѫ — юс вялікі | | |
| П — пакой | 80 | П | Ѩ — ётаваны юс малы | | |
| Р — рцы | 100 | Р | Ѭ — ётаваны юс вялікі | | |
| С — слова | 200 | С | Ѯ — ксі | 60 | Ѯ |
| Т — цвёрда | 300 | Т | Ѱ — псі | 700 | Ѱ |
| Оу — ук | 400 | | Ѳ — фіта | 9 | Ѳ |
| Ф — ферт | 500 | Ф | Ѵ — іжыца | | Ѵ |

*Кірыліца.*

афрыкаты [дж] і [дз] перадаюцца дыграфамі, раздзяляльную функцыю выконвае апостраф. Першая датаваная кніга, напісаная К., — *Астрамірава евангелле* (1056—57).

*Літ.*: Булыка А.М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы. Мінск, 1970; Истрин В.А. 1100 лет славянской азбуки. Москва, 1988.

*Н.В.Пятаева.*

**КІРЫЛЬЧАНКА** Пётр Міхайлавіч (18.10.1914, г. Краснадар, Расія — 20.9.1997), беларускі альтыст, педагог, дырыжор. Засл. артыст Беларусі (1961). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1938). Працаваў у Маскве і Горкім. У 1944—62 саліст Дзярж. сімф. аркестра Беларусі, удзельнік струннага квартэта Бел. філармоніі. У 1970—73 гал. дырыжор Дзярж. тэатра муз. камедыі Беларусі, у 1980—